Каштоўнасці

# Сур'ёзныя размовы пра дарослае

**Маладыя людзі гуртаваліся ў духоўна-асветным цэнтры «Каўчэг» Свята-Елісавецінскага манастыра горада Мінска. Удзельнікамі Міжнароднага маладзёжнага форуму «Сэнс. Жыццё. Будучыня», які прайшоў 26 мая, стала каля 200 чалавек — студэнты ВНУ, прадстаўнікі маладзёжных арганізацый і суполак Беларускай праваслаўнай царквы, члены Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Яны прыехалі, каб сустрэцца з людзьмі, якія маюць аўтарытэт і гатовыя падзяліцца сваім жыццёвым досведам і ведамі, што могуць быць карысныя ў далейшым, калі моладзь будзе ажыццяўляць свае мары і памкненні.**



У сучаснай моладзі яны могуць быць вельмі розныя, але ў пэўны час кожны задумаецца пра стварэнне сям'і і працяг роду. Гэта актуальныя пытанні не толькі для Беларусі, але і шмат для якіх краін, якія клапоцяцца пра паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі. І зусім не абавязкова адкладваць момант стварэння сям'і дзеля таго, каб рэалізоўвацца асабіста і рабіць кар'еру. Пра гэта казалі настаўнікі, якія праводзілі лекцыі і сустрэчы, — людзі, запатрабаваныя ў розных сферах, але якія лічаць галоўнай меркай шчаслівага жыцця моцную сям'ю. Карацей, ішлі сур'ёзныя размовы пра дарослае.

Добрыя справы варта пачынаць з малебну — з благаславеннем усё робіцца больш проста і асэнсавана, а тым больш калі звяртаюцца да святых Пятра і Фяўроніі, якія лічацца заступнікамі сям'і. А пасля настаўнікі правялі заняткі ў чатырох секцыях, на якіх прысутныя вучыліся счытваць эмоцыі (што дапамагае ў жыцці, асабліва ў разуменні блізкіх і пабудове адносін з каханымі), разважалі пра тое, што значыць шчаслівае дзяцінства (каб здолець яго забяспечыць сваім нашчадкам), слухалі філасофскія разважанні пра сэнс жыцця. Інтэрактыў вітаўся, як і праваслаўныя настольныя гульні. Але так ці інакш усе гутаркі былі пра тое, што спатрэбіцца кожнаму незалежна ад абранай спецыяльнасці, якую студэнты ўжо асвойваюць у ВНУ...

Да прысутных звярнуўся **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі:**

— Пытанні, якія ўзнімаліся на форуме, не заўсёды прыцягваюць сучаснага маладога чалавека. Таму што сучасны свет жыве больш па законах практычнасці, паспяховасці. Гэта часам вызначаецца вонкавым бокам. Але асноўныя складнікі — сэнс, жыццё, будучыня — больш абапіраюцца на разгляд унутранага свету чалавека, яго сувязь з духоўнай сферай. Што, па вялікім рахунку, і вызначае яго месца ў будучыні... Хрысціянская вера легла ў аснову нашых каштоўнасцяў, нашай культуры, у разуменне мэт і сэнсу нашага быцця на зямлі. Служыць дабру, міласэрнасці, людзям, Айчыне — гэта вечныя каштоўнасці, без якіх чалавек і не можа адбыцца як асоба. Сотні гадоў гэтым каштоўнасцям служылі нашы продкі. Але можа быць, цяпер яны ўстарэлі і не адпавядаюць патрабаванням прагрэсу, пытанням, што ставіць перад намі сучаснае грамадства?.. Па сутнасці, свет становіцца перад небяспекай расчалавечвання, першай праявай якога становіцца пачуццё глыбокага расчаравання і самоты. Расчараваны і самотны чалавек, як карабель без рулявога, можа нават разбіцца аб прыбярэжныя скалы... Але каштоўнасці любові і міласэрнасці, служэння дабру, людзям, Айчыне не старэюць. Каб жыць на зямлі, яны неабходныя. Дасягненні навукі, культуры з'яўляюцца толькі інструментамі рэалізацыі гэтых каштоўнасцяў.

Іх пераемнасць забяспечвае сям'я, яна ж становіцца для чалавека і школай любові.

— Для беларуса словы «дзеці», «дом», «любоў», «сям'я» — не пусты гук. Калі мы праводзілі даследаванне, то больш за 85 працэнтаў маладых людзей ва ўзросце да 30 гадоў аб'явіла гэта сваёй найвышэйшай духоўнай каштоўнасцю, — адзначыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.** — Але моладзь у першую чаргу думае пра атрыманне адукацыі, пра пабудову кар'еры. У нас мужчына, які ўпершыню бярэ шлюб, мае ўзрост амаль 29 гадоў. Жанчына — 26. Сёння сярэдні ўзрост мамы першынца — 27 гадоў (а ў 1990 годзе не дасягаў 23-х гадоў). Усё гэта адбіваецца на зніжэнні нараджальнасці. І тут адна з задач дзяржавы — зрабіць так, каб маладыя людзі не адкладвалі стварэнне сям'і на потым, а тым больш каб не адкладвалі на потым нараджэнне дзяцей. Задача дзяржавы — дапамагчы падтрымаць сям'ю, на што скіраваны комплекс захадаў.

Заснавальнік і кіраўнік дабрачыннага фонду падтрымкі сям'і, мацярынства і дзяцінства «Пакроў» Андрэй Зубенка эмацыянальна пераконваў: будучыня — гэта не калі-небудзь, а тое, што ствараецца цяпер, кожны дзень. З думкамі пра яе быў арганізаваны рэспубліканскі конкурс «Моладзь Беларусі за жыццё, маральнасць і сямейныя каштоўнасці». Падчас форуму адзначылі найлепшыя сацыяльныя праекты, якія засведчылі: кожны дзень можа быць напоўнены добрымі справамі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# АДПАЧЫНАК З КАРЫСЦЮ: ВАРЫЯНТЫ — НА РОЗНЫ ГУСТ...

## Трымаць руку на пульсе...

— Чым заняць дзіця? Пытанне, якое актуальнае для ўсіх бацькоў сёння, — падкрэслівае **кансультант галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Таццяна АСМАЛОЎСКАЯ.** — Установы адукацыі сур'ёзна рыхтуюцца да летніх канікул, каб прапанаваць школьнікам розныя варыянты занятасці. Загадзя праводзілася апытанне бацькоў, каб даведацца, колькі дзяцей хочуць наведваць аздараўленчыя летнікі пры ўстановах адукацыі, займацца ў аб'яднаннях па інтарэсах і гэтак далей. Такая інфармацыя патрэбная нам, бо арганізацыя летняй занятасці патрабуе вялікіх фінансавых і кадравых рэсурсаў.

Па словах Таццяны Асмалоўскай, летам у Беларусі будуць працаваць 5,9 тысячы аздараўленчых лагераў, дзе адпачнуць 377 тысяч дзяцей. Пад гэтыя мэты задзейнічаюць 146 стацыянарных баз, а таксама ўстановы адукацыі. Лагеры будуць і з дзённым, і з кругласутачным знаходжаннем. Напрыклад, палатачныя — у фармаце пересовачных. На базе ўстаноў дадатковай адукацыі будуць функцыянаваць турыстычныя, гісторыка-археалагічнага кірунку. Увогуле, любы кірунак дзейнасці, якім дзіця займалася цягам навучальнага года, атрымае працяг у рамках профільных лагераў. Для падлеткаў, якія працягваюць трэніровачны працэс ва ўстановах спорту, будуць адкрыты спартыўныя лагеры. Для навучэнцаў, якія жадаюць зарабіць свае першыя грошы, — лагеры працы і адпачынку.

Па словах спецыяліста, многія бацькі яшчэ ў лютым-сакавіку цікавіліся, як атрымаць пуцёўку. Таму сёння абсалютная большасць аздараўленчых лагераў ужо укамплектаваная.

— Тым не менш шанцы ўладкаваць дзіця ёсць, — дадала Таццяна Асмалоўская. — У кагосьці могуць змяніцца планы, будуць вызваляцца месцы. Таму хачу параіць бацькам, як кажуць, трымаць руку на пульсе. Звяртайцеся да заснавальніка лагера, які вы нагледзелі, або ў камісію па аздараўленні па месцы працы. Інфармацыя аб рабоце аздараўленчых лагераў таксама даступная на сайтах устаноў адукацыі, упраўленняў і аддзелаў адукацыі райвыканкамаў, аблвыканкамаў. Створаны інтэрактыўныя інфармацыйныя карты з падрабязнымі данымі: ад месцазнаходжання лагера да наяўнасці пуцёвак і працоўных вакансій.

## Школы юных журналістаў і даследчыкаў

Прадстаўнік Міністэрства адукацыі таксама нагадала, што ў летні перыяд будуць працаваць у штатным рэжыме ўстановы дадатковай адукацыі, якіх у краіне 259:

— Усе аб'яднанні па інтарэсах прадоўжаць сваю работу. Хачу звярнуць увагу бацькоў: вы зможаце прывесці сваё дзіця, нават калі яно не займалася падчас навучальнага года, і запісаць на лета ў тое ці іншае аб'яднанне па інтарэсах. Да таго ж перад установамі адукацыі пастаўлена задача — забяспечыць на працягу ўсяго летняга перыяду доступ да спартыўных аб'ектаў, залаў, стадыёнаў, басейнаў, гульнявых пляцовак. Шмат выязных акцый і мерапрыемстваў будуць арганізаваныя сіламі ўстаноў дадатковай адукацыі. Той жа Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства прапануе шырокую экскурсійную праграму. На сайце гэтай установы можна знайсці інфармацыю, куды паехаць і як правесці час цікава і з карысцю.

Таццяна Асмалоўская звярнула ўвагу бацькоў яшчэ на адну акалічнасць: летам адбываецца актыўная «міграцыя» дзяцей у межах краіны. Але ўсе **мерапрыемствы і аб'яднанні па інтарэсах даступныя для ўсіх школьнікаў незалежна ад месца іх пастаяннага пражывання і вучобы.**

У Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі па традыцыі летняя аздараўленчая кампанія стартуе 1 чэрвеня з маштабнага свята «Дзяцінства — гэта Я і Ты». Яно завершыцца танцавальным флэшмобам. На базе гэтай установы дадатковай адукацыі на працягу многіх гадоў працуе аздараўленчы лагер «Чабарок», які вельмі запатрабаваны ў дзяцей і бацькоў. Ён разлічаны на 18 дзён. Пра гэта расказала **намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце палаца Саіда ВАФІНА.** Для ўдзельнікаў лагера будуць праводзіцца шматлікія конкурсы, турніры, турыстычныя паездкі. У прыватнасці, хлопцы і дзяўчаты пабываюць на «Лініі Сталіна», у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у комплексе «Дудуткі», заапарку, дэльфінарыі, наведаюць тэатры. Першая змена адкрыецца 5 чэрвеня, другая стартуе 4 ліпеня. Дарэчы, на другую змену яшчэ можна трапіць...

Таксама сёлета будзе арганізаваны профільны 18-дзённы лагер «Абаронца Айчыны» — для 30 хлопцаў і дзяўчат з мемарыяльнага атрада Паста № 1 Мінска. Яны не толькі змогуць атрымаць новыя веды па гісторыі Беларусі, але і прадоўжаць несці вахту памяці каля Вечнага агню ў памятныя для Беларусі дні — 22 чэрвеня і 3 ліпеня. Тэрміны функцыянавання лагера разлічваліся так, каб захапіць гэтыя важныя для беларускага народа даты.

Акрамя таго, у Мінскім палацы дзяцей і моладзі адкрыюцца летнія школы па розных кірунках: «Крок у будучыню», дзе выхаванцы будуць атрымліваць веды па робататэхніцы, радыёэлектроніцы, архітэктурным дызайне і іншых дысцыплінах тэхнічнай творчасці, летняя школа для юных журналістаў — для тых, хто хоча рэалізаваць сябе ў медыяпрафесіях, школа «Першыя крокі ў навуку», арганізаваная сумесна з Саветам маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук, школа па выяўленчым мастацтве «Палітра.бай» і іншыя.

На базе палаца будзе працаваць рэсурсны цэнтр «Бяспечнае дзяцінства», які прапануе ўдзельнікам аздараўленчых лагераў пры школах шэраг адукацыйных праграм. Вельмі цікавыя праекты — пазнавальная праграма «Вялікае падарожжа юнага веласіпедыста» па бяспецы на дарозе і «Школа выжывання» — па асновах бяспечных паводзін у прыродзе.

Запланаваны тэматычныя праграмы ў Мінскім планетарыі. У парку Горкага пройдзе маладзёжны інтэнсіў «Смарт-лідар».

Акрамя таго, у Мінскім палацы дзяцей і моладзі працягне сваю работу летам гарадскі цэнтр псіхолага-педагагічнай дапамогі. «Нашы псіхолагі працуюць і з дзецьмі, і з бацькамі, праводзяць дыягностыку прафесійных арыенціраў падлеткаў, гатоўнасці малых да школы. Практыкуюцца як індывідуальныя кансультацыі з бацькамі і дзецьмі, так і групавыя кансультацыі і трэнінгі», — праінфармавала Саіда Вафіна.

## Праца з дазволу бацькоў

Яшчэ адна форма занятасці падлеткаў летам — працаўладкаванне. Летась перагледзелі пералік лёгкіх відаў работ, якія могуць выконваць школьнікі. Ён быў пашыраны, і ахвотныя падзарабіць летам могуць займацца цяпер не толькі кур'ерскай дзейнасцю ці, скажам, азеляненнем, таксама ім стала даступная мыйка аўтамабіляў.

— У канікулярны перыяд падлеткі ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў могуць працаваць не больш як 4 гадзіны 36 хвілін за суткі, ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў — не больш як 7 гадзін, — паведаміла **галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Віялета КРАЎЦОВА.** — Апошнія гады паказалі, што ў моладзі расце інтарэс да магчымасці зарабіць уласныя грошы. Міністэрства адукацыі ва ўзаемадзеянні з упраўленнямі па адукацыі, Мінгарвыканкамам, аблвыканкамамі прымае меры па пашырэнні практыкі арганізацыі часовай працоўнай занятасці. Так, у 2022 годзе было працаўладкавана больш як 50 тысяч чалавек, з іх больш за 40,2 тысячы — ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў.

Каб знайсці сабе месца працы на час летніх канікул, падлеткі могуць звяртацца ва ўпраўленні (аддзелы) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтаў у сваім раённым і гарадскім населеным пункце. Можна звярнуцца ў грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», а таксама да сацыяльнага педагога ці намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце ва ўстанове адукацыі.

Для працаўладкавання падлетка ў абавязковым парадку неабходна прад'явіць наймальніку наступныя дакументы: медыцынскую даведку, пашпарт, дакумент з установы адукацыі. **Падлеткам ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў неабходна прад'явіць таксама пісьмовую згоду аднаго з бацькоў (усынавіцеляў, папячыцеляў).**

Трэба мець на ўвазе, што для падлеткаў ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў устаноўлена скарочаная працягласць рабочага часу. Пры гэтым заработная плата выплачваецца ім у такім жа памеры, як работнікам пры поўнай працягласці штодзённай работы. А працоўная кніжка выдаецца наймальнікам пры ўмове, што работнік адпрацаваў пяць і больш працоўных дзён.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*